Zuckermann]. – New York: Cambridge University Press, 2009. – P. 134 – 161.
10. Število festivalov v organizaciji kulturnih domov, Slovenija, letno // Podatkovni portal SI-STAT [Electr. resource]. – Access mode: http://pxweb.stat.si/pxweb/Dialog/varval.asp?ma=1012304S&ti=&path=../Database/Dem_soc/10_kultura/05_10123_kult_domovi/&lang=2 [Accessed: 27.10.2016].
11. Transforming national holidays: Identity discourse in the West and South Slavic countries, 1985 – 2010 [ed. L. Šarić, K. Gammelgaard and K. Hauge]. – Amsterdam: John Benjamins, 2013. – 314 pp.
12. V gledališčih, kulturnih domovih ter muzejih in galerijah v Sloveniji v 2014 okrog 19.900 kulturnih prireditev // Respublika Slovenija. Statistični urad [Electr. resource]. – Access mode: http://beta.stat.si/StatWebResponsive/News/Index/5749 [Accessed: 27.10.2016].
13. Weisband E. Political culture and the making of modern nation-states / Edward Weisband, Courtney Thomas. – Boulder, London: Paradigm Publishers, 2015. – 323 p.
14. Zakon o spremembah in dopolnitvah Zakona o praznikih in dela prostih dnevih v Republiki Sloveniji (Uradni list RS, № 19/15) // Pravno-informacijskega sistema Republike Slovenije [Electr. resource]. – Access mode: http://www.pisrs.si/Pis.web/pregledPredpisa?id=ZAKO7076 [Accessed: 27.10.2016

# *ЗАРУБІЖНЕ ТА ВІТЧИЗНЯНЕ УКРАЇНСТВО: ВЗАЄМОДІЯ В МИНУЛОМУ ТА СЬОГОДЕННІ*

УДК 94(477)”1940”

*Аляксандр Агееў*

## Погляд энкавэдыстаў на дзейнасць украінскіх арганізацый на тэрыторыі генерал губернатарства Польшча ў прымежнай зоне БССР ў 1940 г.

*Олександр Агєєв:*

## Погляд енкавеесників на діяльність українських організацій на території генерал губернаторства Польщі в прикордонній зоні БССР у 1940 р.

*Цінна інформація про діяльність "українських націоналістів" міститься в розвідкових матеріалах НКВС УРСР про діяльність німецької розвідки та прикордонної поліції, контреволюційних формувань на території Генеральної Губернії Польщі навпроти прикордонної ділянки БССР. У них є статистичні дані про кількість українців, описується українська іноземна преса і т.д. У сферу інтересів енкавеесників потрапляли українські організації УНО, ОУН та інші, діяльність окремих її активістів не тільки на території Підляща, а й частково Холмщини, Лемківщини, Чехословаччини. У зведених матеріалах дається спроба енкавеесного аналізу методів німецької розвідки по залученню українців на бік Німеччини. Незважаючи на очевидну упереженість інформації развідкових даних, в них міститься цінна інформація про діяльність українських активістів і українських організацій на прикордонній території напередодні війни Німеччини і СРСР.*

***Ключові слова:*** *НКВС, українські організації, УНО, ОУН, БССР, Генеральна губернія Польща, Підлящя, Холмщина, Лемківщина, німецька розвідка.*

*Aliaksandr Aheyev*

## View Point of NKVD on the Activities of Ukrainian Companies on the Territory of the General Governor of Poland in the Border Yone of the BSSR in 1940

*Valuable information on the activities of "Ukrainian nationalists" contained in intelligent sources of NKVD in UkrSSR about the activities of German intelligence and border police, contrrevolutional formations on the territory of the General Governorship of Poland close to the border of the BSSR. They include statistics on the number of Ukrainians, describe Ukrainian foreign press. NKVD interested in Ukrainian organizations UNO, OUN and other, in activities of some of its activists not only in the Podlasie, but also partly in Holm, Lemko areas and ,Czechoslovakia. The reports show attempt to analyze the methods of German intelligence to attract Ukrainians on the side of Germany. Despite the obvious bias of intelligent reports, they contain valuable information on the activities of Ukrainian activists and Ukrainian organizations in the border area on the eve of the war in Germany and the Soviet Union.*

***Keywords:*** *NKVD, Ukrainian Organizations UNO, OUN, the Byelorussian SSR, the General Governor of Poland, Podlasie, Holm, Lemko, the German Intelligence Service.*

Пасля падпісання 28. 09. 1939 г. Дамовы аб сяброўстве і мяжы паміж СССР і Германіяй напрыканцы 1939 г. адбылося размежаванне тэрыторыі. Нягледзячы на тое, што нацыянал-сацыялістычная Германія з’яўлялася хаўруснікам савецкай дзяржавы, органы НКУС пільна цікавіліся сітуацыяй ў прымежнай зоне генерал губернатарства Польшча насупраць памежнага ўчастка СССР, якая знаходзілася пад нямецкім кантролем. Перыядычна складаліся сакрэтныя разведзводкі, якія накіроўваліся ў разнастайныя ваенныя, партыйныя і дзяржаўныя органы, у тым ліку партыйным лідарам саюзных рэспублік.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь у фондзе № 4п “Цэнтральны камітэт Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (1918-1941)” захоўваюцца справы з разведзводкамі, якія пад грыфам “цалкам сакрэтна” былі накіраваны

тагачаснаму сакратару ЦК Камуністычнай партыі Беларусі (бальшавікоў) таварышу Панамарэнка. Сёння вопіс № 1 фонда ўтрымлівае справы пад нумарамі 16851, 16852 і 16853 з разведзводкамі НКУС БССР аб органах германскай разведкі гестапа, контррэвалюцыйных фармаваннях, украінскіх нацыяналістах, пагранпаліцыі, дыслакацыі нямецкіх воінскіх частак, настроях у германскай арміі і мерапрыемствах немцаў на тэрыторыі генерал губернатарства Польшча насупраць памежнага ўчастка БССР. Справа 16851 была падпісана 23 верасня 1940 г. і мае аб'ём 16 лістоў. Справа 16852 падпісана 9 кастрычніка 1940 г. і змяшчае інфармацыю на 35 лістах [2]. Справа 16853 падпісана 16 снежня 1940 г. і ўжо мае аб'ём 53 лісты [3]. Вытрымкі з першай і трэцяй зводак былі апублікаваны ў 2011 г. [1. с. 23-27].

Галоўнымі задачамі артыкула з'яўляюцца: паказ погляду беларускіх энкавэдыстаў на стан украінскага руху на тэрыторыі генерал губернатарства Польшча, выяўленне і апісанне інфармацыі, якая змешчана ў пазначаных вышэй разведзводках НКУС БССР аб дзейнасці ўкраінскіх арганізацый і актывістаў. Справа ў тым, што ў сферу інтарэсаў энкавэдыстаў вельмі часта траплялі ўкраінскія арганізацыі УНО, ОУН і інш., дзейнасць асобных яе актывістаў не толькі на тэрыторыі Падляшша, але і часткова Холмшчыны, Лемкаўшчыны, Чэхаславакіі і г.д. З мэтай захавання аўтэнтычнасці зместу дакументаў, разумення мыслення работнікаў НКУС і адчування атмасферы эпохі ў апісальнай частцы захоўваюцца некаторыя тагачасныя савецкія моўныя штампы, выразы і адзнакі ў перакладзе з рускай на беларускую мову. Прозвішчы і тапанімічныя назвы ў артыкуле друкуюцца адпаведна напісанню ў дакументах з пазначэннем іх пры неабходнасці у дужках на рускай мове, як у арыгінале.

З разведзводак вынікае, што ў першую чаргу энкавэдыстаў цікавілі "органы германскай разведкі і яе агентура". У іх утрымліваецца дадзеныя аб агентах і падазроных ў сувязях з "аддзяленнямі гестапа", спосабах пераправы нямецкіх разведчыкаў у СССР і інш. Даволі часта складальнікі данясенняў пазначалі нацыянальную прыналежнасць агентаў і этнічную накіраванасць тых ці іншых арганізацый. Так прыкладам, падкрэслівалася, што асаблівасцю для Ўсходняй Прусіі з'яўляецца прыём ў "СС" і "СА" літоўцаў – германскіх падданых, з ліку тых, хто карыстаўся асаблівым даверам у мясцовых нямецкіх уладаў у памежнай паласе [2, арк. 7].

Першая разведзводка ахоплівала час з 1. 08 па 15. 09. 1940 г. Непасрэдна інфармацыя аб украінскім руху размешчана статыстычна на трох, а рэальна на двух лістах [1. с. 23-24]. У ёй згадваюцца: Камітэт УНА у г. Уладава (Влодава); камандзіраванне камітэтам украінцаў на курсы паліцэйскіх і чыгуначнікаў; выяўлены адрас камітэта ўкраінскіх нацыяналістаў у г. Бяла-Падляска па вуліцы Калеявай (Колеевой), 11; наяўнасць 200-т украінскіх нацыяналістаў у мястэчку Пішчан (Пищан) і дзярэўне Вышняя. Асобна адзначалася, што 2. 08. 1940 г. на сходзе ў вёсцы Орхава, які праводзіў Пятроўскі, было аб'яўлена, што ўкраінцы могуць атрымаць хутары з надзеламі па 10 га ворнай зямлі за кошт немцаў, якія выехалі ў тыл Германіі. Звярталася ўвага на тое, што ў мястэчку Забалоцце (Заболотье) маецца шэсць украінскіх паліцэйскіх, "якія ходзяць у штацкім, на рукаве носяць жоўтую павязку з надпісам "Паліцыя ўкраінская" і пад час выездаў у навакольныя населеныя пункты ім выдаюцца вінтоўкі на вахтцунге вёскі Шастакі (Шостаки).

У зводцы робяцца высновы, што паддобрыванне нямецкімі ўладамі ўкраінскіх конррэвалюцыйных элементаў, пятлюраўцаў, казакоў працягваецца. Для іх ствараюцца некаторыя прывелеі. Адкрыта вядзецца агітацыя за адарванне Ўкраіны ад СССР, за стварэнне самастойнай украінскай дзяржавы. З гэтай мэтай пад кіраўніцтвам нямецкіх афіцэраў і афіцэраў былой польскай арміі на тэрыторыі Сувалкаўскага павета ствараюцца спецыяльныя атрады з украінцаў - пятлюраўцаў, казакоў і іншых контррэвалюцыйных элементаў.

Другая разведзводка раней не публікавалася і ахоплівае час з 15. 09 па 1. 10. 1940 г. Пералік нацыянальных арганізацый у ёй ў кастрычніку 1940 г. быў пачаты з рускай арганізацыі ў Варшаве. Апісанне дзейнасці арганізацыі заняла крыху больш, чым адну старонку [2, арк. 9-10].

Украінскаму руху аўтары кастрычніцкай зводкі прысвяцілі значна больш увагі – пяць лістоў [2, арк. 10-14]. Напачатку пададзены агульныя звесткі аб стане ўкраінскага руху і сістэме кіравання ўкраінскімі тэрыторыямі. Адзначана, што нямецкія ўлады ў Кракаўскай генеральнай губерні блізу савецкай граніцы стварылі ўкраінскую правінцыю, адміністрацыйны цэнтр якой знаходзіцца ў Крыніцах. Адміністрацыйнае кіраванне правінцыяй, на думку энкавэдыстаў, здзяйснялася ўкраінцамі - нацыяналістамі пад кіраваннем немцев. Адзначана, што на Холмшчыне было адкрыта многа новых украінскіх школ. У правінцыі, асабліва ў Лемкаўшчыне, вялася адкрытая антысавецкая прапаганда. У сваіх выступленнях нацыяналісты казалі, што існуе дзве Украіны – "Руская Украïна" і "Самасційная Украïна". Апошнюю, па іх словах, варта было б называць "Нямецкай Украінай", а межы яе штучныя і павінны распасцірацца далёка на Усход [2, арк. 10].

Яшчэ больш увагі было нададзена ўкраінскім арганізацыям, якія дзейнічалі не толькі каля сучаснай мяжы Украіны з Польшчай, але далёка на поўнач уздоўж сучаснай мяжы Польшчы і Беларусі. Так была адзначана актыўнасць украінскіх нацыяналістычных арганізацый у Сувалках і Сувалкаўскім павеце. Наўмысна па пытанню стварэння ўкраінскіх арганізацый ў Сувалкі прыязджалі 9 жніўня 1940 г. прадстаўнікі нямецкіх уладаў. А ўжо 11. 08. 1940 г. праваслаўны поп Жэромскі ў пропаведзі пасля багаслужэння заклікаў вернікаў уступаць у "Саюз украінцаў", кажучы, што члены арганізацыі будуць карыстацца падатковымі ільготамі, будуць забяспечвацца немцамі, што немцы створаць рускія (так у тэксце – аўт.) школы. Акрамя раней выяўленых кіраўнікоў саюза Д'ячэнка і Кажухаря, органы НКУС лічылі адным з кіраўнікоў сувалкаўскай арганізацыі Тарасенка. Збіралася арганізацыя ў доме Крымавай па вул. Новы Свет, 61 г. Сувалкі. Рабіўся вывад, што прадстаўнікі нямецкіх уладаў у Сувалкаўскім павеце вялі вярбоўку ў члены ўкраінскай нацыяналістычнай арганізацыі "Саюз украінцаў" сярод ваеннапалонных

салдат былой польскай арміі, які ўтрымоўваліся ў лагарах для ваеннапалонных. Тых, хто ўступаў у саюз і даваў пісьмовую згоду быць актыўным яго членам, вызвалялі з лагераў [2, арк. 11-12].

У зводцы падрабязна паказаны склад “камітэта ўкраінскіх нацыяналістаў” вёскі Орхаўск (Орховск) Холмскага павета. Сярод яго членаў былі выяўлены: Пятроўскі Васіль Ільіч, 37 г., старшыня камітэта і адначасова член Уладаўскага (Влодавского) камітэта (падазраваўся ў сувязах з гестапа); Астапчук Андрэй Ільіч, 36 г. (падазраваўся ў сувязах з гестапа); Крымюк Мікалай Цімафеевіч; Растоўскі Уладзімір, 45 г., “вуйт” Уладаўскай воласці, адначасова член Уладаўскага камітэта; Лабада (Лобода) Аляксей 40 г.; Крацюк (Кротюк) Цімафей, 42 г.; Хвалюк Антон Акімавіч, 38 г.; Грынь (Гринь) Мікалай Ульянавіч, 35 г. Усе члены пазначаны, як украінцы. Адзначана, што “камітэт садзейнічае ўладам у зборы падаткаў з насельніцтва, выконвае сбор сродкаў на ўтрыманне ўкраінскіх школ і ўстаноў, уваходзіць у падпарадкаванне Уладаўскага валаснога камітэта ўкраінскіх нацыяналістаў” [2, арк. 13].

У развезводцы дзейнасці ўкраінскіх арганізацый прысвечаны і вытрымкі з бюлетэню “Польшча жыве”, у якім прыводзяцца публікацыі нелегальнай украінскай газеты “Меч і Плуг” за №15. У бюлетэню ўказваецца, што газета “Меч і Плуг” распаўсюджвае ў вялкай колькасці пракламацыі на ўкраінскай мове, і ў пракламацыях апошняга часу: “Украінцы працягваюць руку палякам для міру, разумеючы што інтарэсы іх народа ляжаць над Дняпром, а не ў змешаных у нацыянальных адносінах раёнах Усходняй Малапольшчы /Заходняй Украіны/. Украіна была і ёсць пад пагрозай з боку Расіі і Германіі і яе ўратаванне можа быць толькі у супрацоўніцтве з Польшчай і Чэхаславакіяй. “Меч і Плуг” заклікае нас (палякаў – аўт.) аднесціся пазітыўна да гэтага закліку, нягледзячы на тое, што частка ўкраінцаў знаходзіцца на паслугах немцаў” [2, арк. 13]. Магчыма ў данясеннях агентаў НКУС утрымліваліся памылковыя або неправераныя дадзеныя і ацэнкі, у тым ліку этнічнай прыналежнасці ўказанных выданняў. Тым не менш, скадальнікі разведзводцы палічылі неабходным пазначыць спробы наладжвання кантактаў польскіх і ўкраінскіх арганізацый.

Падсумоўваючы вынікі сабраных агентурай звестак энкавэдысты зрабілі агульны негатыўны для ўкраінскага руху вывад: “З гэтага бачна, што немцы выкарыстоўваюць украінскіх нацыяналістаў, як кадры для барацьбы супраць СССР… Як вядома нам з іншых агентурных дадзеных усе ўкраінскія нацыяналістычныя арганізацыі праводзяць прагерманскую палітыку і субсідзіруюцца германскімі ўладамі” [2, арк. 14].

Надалей на двух старонках (фактычна па аб’еме адной – аўт.) разведзводкі апісваецца дзейнасць польскіх нацыялістычных арганізацый. Такім чынам бачна, што найбольшую ўвагу сярод нацыянальных арганізацый у прымежнай тэрыторыі БССР энкавэдысты надалі менавіта ўкраінскім, а не польскім, рускім ці літоўскім арганізацыям. Далейшая частка разведзводцы прысвечана стану мастоў, дарог, бетонных прац, абарончым пабудовам, радыёстанцыям, пошце, тэлеграфу, нямецкай пагранічнай ахове, дыслакацыі воінскіх частак, формам дакументаў для грамадзян і г.д.

Трэцяя разведзводка за перыяд з 1. 10 па 1. 12. 1940 г. па аб’екту і прадмету ўвагі ўвогуле супадае з іншымі зводкамі. Пры гэтым значна павялічваецца аб’ем звестак на 53-х лістах, што можа быць патлумачана як большым двухмесячным тэрмінам агляду сітуацыі; верагоднасцю таго, што з набліжэннем 1941 г. павялічылася пагроза пачатку вайны і пільнасць органаў НКУС; так і паляпшэннем спосабаў збору інфармацыі. Яшчэ адной характарыстычнай з’явай з’яўляецца вылучэнне ўжо ў назве снежанскай разведзводцы “украінскіх нацыяналістаў”, якія пазначаны асобна і стаяць першымі перад указаннем на іншыя “контррэвалюцыйныя фармаванні” [3].

На першых 15-ці старонках зводкі разглядаецца “дыслакацыя германскіх развед-вальных органаў гестапа”, даецца спроба энкаве-дэшнага аналізу метадаў нямецкай выведкі па прыцягненню насельніцтва, у тым ліку ўкраінцаў, на бок Германіі і іх вярбоўкі. Дзейнасць украінскіх арганізацый разглядаецца на старонках 16-20 з падзагалоўкам: “Аб дзейнасці ўкраінскіх нацыяналі-стаў на тэрыторыі генерал-губернатарства”.

Папачатку ў разведзводцы канстатавалася па дадзеных закардоннай агентуры УПВ НКУС БССР, што цэнтр “Украінскага Нацыянальнага Аб'яднання” (“УНА”) у Германіі знаходзіўся ў Берліне, што яно называла сябе грамадскай арганізацыяй і заўляла, што палітычнай працы не вядзе. Сцвярджалася, што на працягу 1939 г. сяброўства “УНА” ўзрасло з 550 чалавек да 3 тыс. чалавек, якія знаходзіліся ў 50 арганізацыях, а цэнтр меў аддзелы: асветніцкі, культурны, літаратараў і журналістаў, лекараў, інжынераў, жаночы і драматычную студыю. Звярталася ўвага на тое, што Украінскае бюро ўзаемадапамогі ў Празе раней называлася “Украінскім камітэтам ўзаемадапамогі для бежанцаў з Карпацкай Украіны”, а цяпер мае задачу дапамогі бежанцам і з іншых украінскіх зямель. У зводцы падаваліся сціслыя статыстычныя звесткі пра 535 тыс. украінцаў на тэрыторыі Германіі плошчай 14 450 кв. км. (Холмшчына, Падляшша, Львоўшчына, Сеншчына, Лемкаўшчына) і размеркаванні па рэгіёнах 850 пераважна ўкраінскіх сёлаў. Ніжэй у зводцы паведамляюцца адрасы сямі вядомых украінскіх нацыяналістычных арганізацый за мяжой і ідзе пералік 13 выданняў украінскай замежнай прэсы [1, с. 25-26; 3, арк. 16-19].

Па звестках агентуры арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў «АУН» у г. Сувалкі і ў м. Плацычна (Плоцычно) вырасла да 700 членаў. У сярэдзіне верасня 1940 г. прадстаўнікі цэнтра арганізацыі “Саюз украінцаў” прыехалі з Берліна ў г. Сувалкі, дзе мелі сустрэчу са святаром праваслаўнай царквы Жыроўскім (мажліва Жыронскім ці Жырокскім – аўт.). Пасля гэтай сустрэчы святар прыступіў да вярбоўцы ў члены “Саюза ўкраінцаў”. З ліку ім завербаваных у арганізацыю выяўлены бядняк в. Пакроўск (Покровск) Верус Трафім. Украінскія нацыяналісты тут забяспечваліся ў крамах нароўні з немцамі і атрымлівалі некаторыя прывілеі пры атрыманні работы, а нямецкія ваенныя спецыялісты з сябрамі гэтай арганізацыі праводзілі заняткі па ваеннай справе [3, арк. 19-20].

На поўдзень ад Сувалак Камітэт ўкраінскіх нацыяналістаў у г. Бел-Падляску па дадзеных агентаў НКУС таксама выкарыстоўваў духавенства для агітацыі сярод ўкраінскага насельніцтва: "Папы сярод насельніцтва агітуюць "за дапамогу ў стварэнні магутнай Украінскай рэспублікі пад пратэктаратам Германіі". Гэты камітэт размяшчаўся на плошчы "Свабоды", а ўзначальваў яго Глебавіцкі (Глебовицкий). Прадстаўнікі гэтага камітэта спрабавалі ў некаторых населеных пунктах, напрыклад, у в. Бубель Стары пераканаць вернікаў у неабходнасці пераводу богаслужэння ў цэрквах з рускай на ўкраінскую мову, на што насельніцтва адказала адмовай [3, арк. 20].

На тэрыторыі Холмскага павета некторыя чыноўнікі мясцовых органаў улады спачувалі ўкраінскім нацыяналістам і заклікалі насельніцтва здаваць сельскагаспадарчыя прадукты ўладам пад лозунгам: "Дапаможам стварыць Вялікую Самасційную Ўкраіну з цэнтрам у г. Кіеве". Уладаўскі камітэт украінскіх нацыяналістаў паслаў сваіх настаўнікаў у школы: в. Лейна (Лейно), в. Ламніца (Ломница), в. Воля Верашчынская (Верещинская) і в. Віточна (Виточно) [3, арк. 20].

Асаблівую пільнасць агенты выяўлялі да мажлівай вярбоўцы ўкраінскага насельніцтва ў школу дыверсантаў. У зводцы паведамлялася, што на тэрыторыі Уладаўскай воласці Холмскага павета ўкраінскія нацыяналістычныя арганізацыі з ліку сваіх членаў завербавалі да 300-т чалавек у школу па падрыхтоўцы дыверсантаў для пасылкі ў УССР. Паводле першасных дадзеных УПВ НКУС БССР, вышэйпаказаныя школы знаходзяцца ў г. Уладава, курсанты якой па заканчэнні школы павінны будуць нібыта праз Галіцыю накіроўвацца ў УССР для здзяйснення там дыверсійных актаў. Настаўнік украінскай школы ў в. Лінюшкі (Линюшки), па ад'ездзе заявіў, што едзе на курсы "здабываць Кіеў" [3, арк. 21; 4, с. 211].

Дзейнасці польскіх арганізацый была прысвечана толькі палова старонкі. Відавочна, што найбольшую ўвагу сярод нацыянальных арганізацый у прымежнай тэрыторыі БССР энкавэдысты надавалі менавіта ўкраінскім, а не польскім, рускім, ці літоўскім арганізацыям. Безумоўна выклікае здзіўленне адсутнасць восенню 1940 г. звестак аб дзейнасці ў прымежнай паласе беларускіх нацыяналістычных арганізацый, асабліва з улікам іх моцы ў Заходняй Беларусі ў 1920 – пачатку 1930-х гг.

Падсумоўваючы, можна адзначыць, што нягледзячы на відавочную перадузятасць інфармацыі разведзводак, у іх маецца каштоўная інфармацыя аб дзейнасці ўкраінскіх актывістаў і ўкраінскіх арганізацый напярэдадні вайны Германіі і СССР у прымежнай зоне – на тэрыторыі Падляшша, часткова Холмшчыны, Лемкаўшчыны. Са зводак вынікае, што дзейнасць украінскіх арганізацый УНА, АУН і інш. была распаўсюджана далёка на поўнач ад сучаснай мяжы Беларусі і Ўкраіны. Бачна, што практычна любая дзейнасць украінскіх актывістаў, напрыклад гаспадарчая ці школьніцтва, разглядалася з падазрэннем і трактавалася, як антысавецкая і нацыяналістычная, што ўкраінскі рух напярэдадні вайны Германіі і СССР ужо разглядаўся, як контррэвалюцыйны і варожы. Органы НКУС лічылі, што ўсе ўкраінскія нацыяналістычныя арганізацыі праводзяць прагерманскую палітыку і субсідзіруюцца германскімі ўладамі. Гэтыя вывады органаў НКУС 1940-х гадоў і сёння ў розных інтэрпрытацыях, часцяком слова ў слова, паўтараюцца ў шматлікіх прапагандысцкіх расійскіх выданнях і многіх рускамоўных гістарычных працах.


1. ОУН-УПА в Беларуси. 1939-1953 гг. : документы и материалы / сост. В. И. Адамушко [и др.]; редкол, : В. И. Адамушко [и др.].. – 2-е изд. – Мн.: Вышэйшая школа, 2012. – 528 с.

2. Разведсводка НКВД БССР об органах германской разведки, контрреволюционных формированниях, погранполиции, дислокации немецких воинских частей и мероприятиях немцев на территории генерал-губернаторства против пограничного участка БССР // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 4П, Воп. 1, Спр. 16852.

3. Разведсводка НКВД БССР о дислокации германских разведывательных органов гестапо, украинских националистах, контрреволюционных формированниях, германской пограничной полиции, настроениях в германской армии и мероприятиях немцев на территории генерал-губернаторства против пограничного участка БССР // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 4П, Воп. 1, Спр. 16853.

4. Украинские националистические организации в годы Второй мировой войны. Документы: в 2 т. Т. 1 : 1939–1943 / под ред. А. Н. Артизова. — М. : Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 2012. — 878 с.: ил


УДК 371.2 : 373.1(477)

*Тетяна Антонюк*

## Навчальна книжка в українській діаспорі як фактор збереження національної ідентичності

*Аналізується навчальна книжка української діаспори як важлива культурно-духовна основа збереження національної ідентичності наших співвітчизників у країнах поселення та забезпечення діалогу між Україною і світом. Розглядаються культурно-освітні потреби українців на еміграції, проблеми налагодження системи освіти та видавничої справи для забезпечення українських шкіл навчальною літературою. Показана роль видатних діячів освітньої і видавничої справи в діаспорі, котрі багато зробили для формування позитивного іміджу України у світі та налагодження культурно-освітнього діалогу між українцями й іншими народами.*

***Ключові слова:*** *діаспора, зарубіжна україніка, навчальна книжка, видавництва, книжкова культура.*